УДК 947.6 «1917»

І. М. Рыжанкоў, асістэнт

# ГАЛОЎНЫ І ГУБЕРНСКІЯ ЗЯМЕЛЬНЫЯ КАМІТЭТЫ НА ПАЧАТКОВЫМ ЭТАПЕ ПАДРЫХТОЎКІ АГРАРНАЙ РЭФОРМЫ: ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСІ

In the article the problem of activity of Main and province landed committees lights up for preparations of agrarian reform on the initial stage of development of February revolution, on materials of the Byelorussian provinces. Importance and ambiguousness of agrarian question is shown in the context of decision of food problem, victory completion of war with the German empire, fight of social and political organizations, aspiration of peasant population of Russia to improve the financial position.

**Уводзіны.** Праблему падрыхтоўкі Часовым урадам аграрнай рэформы і яе асаблівасці на Беларусі часткова закранaлі савецкія гісторыкі: Ф. А. Зеляноўскі, І. М. Ігнаценка, В. І. Кастрыкін. На сучасным этапе развіцця айчыннай гістарыяграфіі не з’явілася ніводнага грунтоўнага даследавання па такой важнай аграрнай тэматыцы перыяду 1917 г.

**Асноўная частка.** Пасля звяржэння самадзяржаўя патрэба ў ажыццяўленні аграрнай рэформы падмацоўвалася неабходнасцю пашырэння сацыяльнай апоры новага ладу. Але Часовы ўрад, зыходзячы з небяспекі пагаршэння харчовай сітуацыі ў краіне і зніжэння баяздольнасці расійскай арміі, якая магла ўзнікнуць ужо вясной, пад час перадзелу зямель, абмежаваўся агульнай заявай аб вырашэнні гэтага пытання Устаноўчым сходам. Такая пазіцыя кабінета Г. Я. Львова была падтрымана Петраградскім Саветам, Усерасійскім Сялянскім саюзам і іншымі арганізацыямі, у тым ліку на Беларусі. Агульнымі намаганнямі ўрадавых, земскіх, грамадска-палітычных і іншых структур сялянству была растлумачана перспектыва вырашэння аграрнай рэформы, а таксама акрэслена кола яго абавязкаў у напрамку пераадолення харчовага крызісу і рэалізацыі дзяржаўнай манаполіі на хлебанарыхтоўкі.

Міністэрства земляробства ўзначаліў А. І. Шынгароў, па партыйнай прыналежнасці кадэт. Бліжэйшымі супрацоўнікамі ім былі запрошаны «выключна эсэры» [1, с. 115]. Важным крокам Часовага ўрада ў сферы аграрнай палітыкі стала яго пастанова ад 17 сакавіка аб перадачы ў распараджэнне міністэрства земляробства ўдзельных і кабінецкіх зямель. З гэтай нагоды Часовы ўрад у сваім звароце ад 19 сакавіка прызнаваў падзел зямельнага фонду краіны і вырашэнне нястачы зямлі ў вяскоўцаў як «самую сур’ёзную сацыяльна-эканамічную задачу» і таму ставіў мэтай «найхутчэйшае выкананне падрыхтоўчых работ» у гэтым накірунку [2]. Земляробы запэўніваліся ў абавязковым ажыццяўленні зямельнай рэформы пасля склікання Устаноўчага сходу, а да таго часу заклікаліся ўстрымацца ад гвалтоўных захопаў. Натуральна, што пераход азначаных зямель да дзяржавы істотна не паляпшаў гаспадарчага становішча сялян, затое ўзмацняў іх спадзяванні на ажыццяўленне аграрнай рэформы і, адпаведна, стымуляваў удзел у забеспячэнні прадуктамі арміі і горада.

Клопатам аб пераадоленні харчовага крызісу ва ўсерасійскім маштабе была прасякнута наступная пастанова Часовага ўрада ад 11 красавіка, якая скіроўвалася на ашчаднае выкарыстанне пашы і прадухіленне скарачэння пасяўных плошчаў пад ураджай яравых 1917 г. Але, у адрозненне ад пастановы аб удзельных і кабінецкіх землях, прынятае кабінетам міністраў «Палажэнне аб ахове пасеваў» істотным чынам закранала інтарэсы ўсіх асоб, занятых у сельскагаспадарчай сферы. У прыватнасці, азначаная пастанова пазбаўляла ўласнікаў і арандатараў правоў на незасеяную пашу і перадавала яе ў распараджэнне харчовых камітэтаў. Відавочна, што ва ўмовах дэмакратызацыі органаў кіравання, у тым ліку азначаных камітэтаў, сяляне набывалі рэальныя шанцы для паляпшэння свайго становішча праз меўшыя адбыцца перамены ў формах землекарыстання.

Разам з тым урад усведамляў, што яго імкненне сканцэнтраваць усю ўвагу асноўнай масы земляробаў на вырашэнне харчовай праблемы без адпаведных зрухаў у сферы падрыхтоўкі да аграрнай рэформы не магло быць дзейсным і доўгачасовым ужо таму, што сяляне ў меншай (з іншых пластоў насельніцтва імперыі) ступені адчувалі недахоп прадуктаў харчавання, таму і кола іх інтарэсаў у першую чаргу і непазбежна «замыкалася» на зямлі. У гэтай сувязі з вялікай доляй упэўненасці можна сцвярджаць, што кабінет міністраў, і Міністэрства земляробства у прыватнасці, пайшлі на ўтварэнне зямельных камітэтаў для таго, каб накіраваць наспеўшы сялянскі аграрны рух у кантралюемае рэчышча пад лозунгам падрыхтоўкі да аграрнай рэформы, вядома ж, у суправаджэнні адпаведнай агітацыйна-прапагандысцкай кампаніі. У гэтым сэнсе першы крок да яе (рэформы) увасобіўся ў праекце азначанага міністэрства ад 21 красавіка аб заснаванні зямельных камітэтаў (галоўнага, губернскіх, павятовых, валасных), якім даручалася «распрацоўка неадкладных мер для вырашэння зямельнага пытання Устаноўчым сходам». Як паведамлялася ў адозве за подпісам

Г. Львова і А. Шынгарова, на зямельныя камітэты «ўскладаецца збіранне звестак аб мясцовых зямельных парадках і зямельных патрэбах насельніцтва і на працягу пераходнага часу да правядзення зямельнай рэформы ва Устаноўчым сходзе – рашэнне спрэчак і непаразуменняў па зямельных справах» [3, с. 855].

Утварэнне Галоўнага зямельнага камітэта адбылося 19 мая, як заяўлялася ў адмысловай з гэтай нагоды дэкларацыі, «у адпаведнасці з новымі патрэбамі нашай эканомікі, з пажаданнямі большасці сялян і праграмамі ўсіх дэмакратычных партый краіны асноўным прынцыпам маючай адбыцца зямельнай рэформы павінна стаць перадача ўсёй апрацоўваемай зямлі тым, хто яе апрацоўвае» [4, с. 157]. У склад камітэта ўваходзілі: міністр земляробства А. І. Шынгароў (з канца мая В. М. Чарноў) і яго таварышы (у тым ліку эсэр П. А. Віхляеў), старшыня А. С. Поснікаў (прагрэсіст), таварыш старшыні С. А. Маслаў (эсэр), 24 члены, кіраўнік спраў; па адным прадстаўніку ад губернскіх зямельных камітэтаў, шэсць – ад Усерасійскіх Сялянскага саюза і Савета сялянскіх дэпутатаў, тры – ад Часовага камітэта Дзяржаўнай думы, Усерасійскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, Кааператыўнага Саюза, адзінаццаць – ад партый, пяць – ад буйнейшых навуковых эканамічных таварыстваў і інш. З іх да эсэраў належала 6 чалавек, энэсаў і «трудавікоў» – 14, сацыялдэмакратаў – 5, кадэтаў – 17, прагрэсістаў – 4, акцябрыстаў і правей за іх – 14 [5].

Наогул, усе ўплывовыя сілы краіны, за выключэннем бальшавікоў, выказалі надзвычайную зацікаўленасць у працы камітэта. Нават у яго рабочым органе – Савеце, замест запланаваных 12 было задзейнічана больш за 60 чалавек. Паводле ўспамінаў аднаго з яго членаў – кадэта С. І. Шыдлоўскага, «настрой панаваў у камітэце чыста эсэраўскі; у яго складзе знаходзілася некалькі членаў гэтай партыі... былі сяляне, партыйная прыналежнасць якіх невядомая мне, але моцна аб'яднаныя моцным жаданнем пажывіцца дарма чужым дабром» [6, с. 124]. Губернскім і павятовым зямельным камітэтам, пры ўмове іх пагаднення з мясцовымі ўрадавымі органамі, ставілася ў абавязак вырашэнне зямельных спрэчак. Значная роля ў тым адводзілася прымірэнчым камерам, ствараемым з іх удзелам. З дазволу Галоўнага губернскія і павятовыя зямельныя камітэты сумесна з харчовымі мелі права распараджацца прыватнай зямельнай і сельскагаспадарчай маёмасцю.

Меркавалася, што ў губернскія зямельныя камітэты павінны ўваходзіць па чатыры члены ад губернскага і па адным ад гарадскога выканаўчага камітэта (да моманту арганізацыі дэмакратычна абраных губернскіх земскіх гласных і гарадскіх дум), па адным прадстаўніку ад павятовых зямельных камітэтаў, па тры – ад эканамічных аддзелаў губернскай земскай управы, па адным – ад акруговага суда, упаўнаважаны ад міністра земляробства і некалькі асоб з правам дарадчага голаса па запрашэнню старшыні. Прынцып фарміравання павятовага зямельнага камітэта нагадваў губернскі. Тут мусілі засядаць прадстаўнікі павятовага і гарадскога выканаўчага камітэта (да моманту арганізацыі дэмакратычна абраных губернскіх земскіх гласных і гарадскіх дум), валасных зямельных камітэтаў, земскія работнікі, міравы суддзя і некалькі асоб з правам дарадчага голаса па запрашэнню старшыні. Нарэшце, валасны зямельны камітэт намячаўся ў складзе пяці работнікаў і трох намеснікаў, але да ўвядзення валаснога земства парадак выбараў членаў вызначаўся павятовым зямельным камітэтам. 24 мая на першым пасяджэнні Галоўнага зямельнага камітэта асноўнай задачай прызнавалася даследаванне зямельнай плошчы, якая падлягала пераходу «працоўнаму насельніцтву». Такім чынам, нягледзячы на прысутнасць у камітэце ўплывовага кола прыхільнікаў ліберальнага (праз захаванне інстытута прыватнай уласнасці) шляху вырашэння аграрнага пытання, думка аб перадачы зямлі тым, хто яе апрацоўваў, выглядала бясспрэчнай.

На Беларусі, як і ў цэлым па Расіі, вядучую ролю ў стварэнні зямельных камітэтаў адыгралі ўрадавыя структуры. Меркавалася, што губернскі зямельны камітэт будзе складацца з прадстаўнікоў камісарыята і павятовых зямельных камітэтаў. З гэтай нагоды 26 красавіка Савет пры Віцебскім губернскім камісары вылучыў са свайго складу 4 прадстаўнікоў і накіраваў адпаведныя тэлеграмы з прадпісаннем абраць павятовыя зямельныя камітэты. На пачатку чэрвеня зноў створаны губернскі зямельны камітэт узначаліў А. А. Драздзецкі. Ён жа на першым сялянскім з'ездзе быў абраны старшынёй выканкама губернскага Савета.

Такім чынам, заклапочанасць віцебскіх сялян лёсам аграрнага пытання перадвызначала іх вялікую ўвагу да дзейнасці зямельных камітэтаў. Характэрна, што ў чэрвені дзейнасць губернскага зямельнага камітэта атрымала высокую ацэнку. Паводле слоў члена Галоўнага зямельнага камітэта Кірычэнкі, «можна быць спакойным за вырашэнне зямельнага пытання, калі ён будзе па ўсёй Расіі знаходзіцца ў такіх руках, у якіх ён знаходзіцца ў Віцебску» [7, арк. 9].

У другой палове мая адпаведныя захады прадпрыняў губернскі выканкам Міншчыны, які вылучыў у губернскі зямельны камітэт П. А. Еўстратава, П. В. Іванова (служачы УЗС), Р. А. Скірмунта (землеўласнік) і С. С. Юрыса (селянін Навагрудскага пав.). Утварэнне камітэта планавалася завяршыць 14 чэрвеня на адмысловым з'ездзе, але сялянскія дэлегаты выступілі супраць удзелу ў ім «памешчыкаў і інтэлігентаў». Акрамя таго, яны былі заклапочаны

слабым прадстаўніцтвам «працоўнага элементу». Урэшце, толькі ў ліпені камітэт быў абраны. На кіруючую пасаду прэтэндавалі старшыня сялянскага Савета Мінскай і Віленскай губ. М. А. Міхайлаў і член Камітэта грамадскай бяспекі С. П. Кавалік, але выбаршчыкі выказаліся за апошняга. 5 ліпеня ў мэтах «дэмакратызацыі губернскага зямельнага камітэта» ў яго былі дэлегаваны 2 прадстаўнікі ад Мінскага Савета рабочых, салдацкіх і Савета сялянскіх дэпутатаў – М. А. Міхайлаў і Маронка [8, с. 447].

Як і паўсюдна, у арганізацыі зямельнага камітэта Віленска-Ковенскай губ. вызначальную ролю адыгравалі ўрадавыя сілы, у прыватнасці, губернскі камісар В. С. Балай. Так, 4 чэрвеня скліканы ім губернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў стварыў зямельны камітэт. У далейшым сялянскія дэпутаты выказваліся за папаўненне складу зямельных камітэтаў прадстаўнікамі ад Савета сялянскіх, рабочых і салдацкіх дэпутатаў і палітычных партый. Мала таго, названыя дэпутаты настойліва патрабавалі ўключыць 7 прадстаўнікоў ад Савета сялянскіх дэпутатаў у Галоўны зямельны камітэт.

Заснаванню Магілёўскага губернскага зямельнага камітэта папярэднічала нарада 17 мая, арганізаваная памочнікам губернскага камісара Р. І. Пеўзнерам, з удзелам прадстаўнікоў мясцовых «арганізацый сацыялістычных партыйных груп», а таксама Саветаў, саюзаў салдат і афіцэраў, настаўнікаў, аграномаў, статыстыкаў і інш. Запрошаныя азначылі сваёй задачай выпрацоўку варыянтаў аграрнай рэформы і прызналі пажаданым перадаць у бліжэйшы час усю зямельную ўласнасць у распараджэнне зямельных камітэтаў [9, арк. 38]. Актыўнасць левых партый на гэтай нарадзе істотна адбілася 15–17 чэрвеня на рашэннях сходу з нагоды стварэння губернскага зямельнага камітэта (старшыня Р. І. Пеўзнер). Так, на ім былі прыняты «прынцыповыя рашэнні» аб надзяленні зямельных камітэтаў правам перагляду ўсіх пазямельных дагавораў, усталявання памераў арэнднай платы, размеркавання зямлі паміж «працоўным насель-ніцтвам», якое адчувала ў ёй вострую патрэбу. У некаторых момантах названыя «рашэнні» адбіліся ў зацверджаным «Наказе па выкарыстанні «Палажэння аб зямельных камітэтах». Сфера дзейнасці губернскага і павятовых камітэтаў, у параўнанні з зафіксаванымі ў пастанове ад 21 красавіка палажэннямі, пашыралася. Напрыклад, у пытаннях ажыццяўлення кантролю за купляй і продажам зямель, эксплуатацыяй леса, усталяваннем парадку ўзносу за арэнду зямельных і лясных угоддзяў. Кампетэнцыя валасных зямельных камітэтаў раскрывалася ў трох пунктах: вырашэнне зямельных спрэчак (у межах дзеючых законаў); заснаванне прымірэнчых камер; правядзенне пастаноў цэнтральнай улады, губернскага і павятовых зямельных камітэтаў. Вынікам з'езда стала абранне ўправы губернскага зямельнага камітэта ў складзе П. М. Воранава (старшыня), М. П. Пржыбішэўскага, Ф. Фядотава і Д. М. Ясянкова. У якасці прадстаўнікоў у Галоўны зямельны камітэт былі абраны А. Ц. Вазіла і Р. І. Пеўзнер [10, арк. 19].

З цягам часу на Беларусі, як і паўсюдна, пачалі ўтварацца павятовыя і валасныя зямельныя камітэты. Прынцып стварэння першых нагадваў губернскі. Характэрнай рысай валасных камітэтаў з'яўляўся іх пераважна сялянскі склад. Прыступаючы да фарміравання зямельных камітэтаў, якім належала практычнае ажыццяўленне рэформы, Часовы ўрад абапіраўся на ўкаранёнае ў грамадскую свядомасць палажэнне аб недапушчальнасці замахаў на зямельную ўласнасць да Устаноўчага сходу. У пэўным сэнсе тыя ж мэты праследавалі і арганізатары майскага Усерасійскага сялянскага з'езду, які ў ліку іншых рэзалюцый прыняў «Пастанову па зямельным пытанні». Як адзначалася ў дакуменце, «ад гэтага часу не толькі канчатковае вырашэнне зямельнага пытання ва Устаноўчым сходзе, але і ўся справа падрыхтоўкі гэтага пытання ў цэнтры і на месцах працаю мясцовых і Галоўнага зямельнага камітэтаў пераходзіць у рукі самога працоўнага насельніцтва» [11, арк. 6].

У дадзеным выпадку, насуперак палітыцы Часовага ўрада, статус зямельных камітэтаў значна павышаўся, а само аграрнае пытанне ў большай ступені пераводзілася з тэарэтычнай плоскасці ў практычную: па-першае, зямельныя камітэты набывалі велізарныя паўнамоцтвы і фактычна выходзілі з-пад кантролю губернскіх і павятовых камісарыятаў Часовага ўрада. А падругое, азначаныя зямельныя органы мусілі ператварыцца ў інструмент класавай (сялянскай) і партыйнай (эсэраўскай), а не дзяржаўнай палітыкі. У значнай ступені таму паспрыяла змена ва ўрадзе: замест кадэта А. І. Шынгарова, які ў свой час «надзвычай неахвотна прыняў пасаду міністра земляробства», яе заняў эсэраўскі лідэр В. М. Чар юў . Як сведчыць С. І. Шыдлоўскі, «замена на міністэрскай пасадзе Шынгарова Чарновым ніяк не адбілася на рабоце Галоўнага зямельнага камітэта. Шынгароў ніколі яго не наведваў, Чарноў – крайне рэдка, дзеячы ў ім як былі эсэры, так і засталіся» [12, с. 124].

30 мая новым міністрам была выдадзена пастанова, якая прыпыніла выхад вяскоўцаў на хутары і скасавала землеўладкавальныя камісіі, якія былі створаны ў свой час у межах аграрнай рэформы П. А. Сталыпіна. Тым самым эсэрамі быў здзеснены чарговы крок да ажыццяўлення свайго праграмнага палажэння аб ліквідацыі прыватнага землеўладання. Натуральна, што лёс будучай рэформы цікавіў усе колы расійскага грамадства.

Так, Петраградскі аддзел Лігі аграрных рэформ заняўся склікаННем на 23–25 чэрвеня II Усерасійскага з'езда «ў мэтах падвергнуць усебаковаму арганізаванаму абмеркаванню асноўных пытанняў маючай адбыцца аграрнай рэформы», і таму разаслаў запрашэнні на адрас губернскіх земскіх упраў. Гэтая ж праблема пастаянна разглядалася на пасяджэннях Усерасійскага саюза землеўласнікаў. Што датычыць прынятых праграмных палажэнняў, то паўсюдна саюз імкнуўся абгрунтаваць неабходнасць аб'яднання ўласнікаў без саслоўных і канфесійных адрозненняў, незалежна ад колькасці зямлі і палітычных поглядаў.

Ход падрыхтоўкі да ажыццяўлення аграрнага пытання сустракаў істотныя перашкоды. Паводле газеты «Воля народа» ад 2 ліпеня, на II сесіі Усерасійскага з'езда зямельных камітэтаў аграрная палітыка міністэрства земляробства была ахарактарызавана як «недастаткова энергічная».

25 жніўня на III сесіі Галоўнага камітэта В. М. Чарноў мусіў канстатаваць наяўнасць партыйна-класавага ўціску на зямельныя камітэты. «Праца камітэтаў цяжкая тым, – казаў ён у сваім выступленні – што ім даводзіцца быць паміж двух агнёў: з аднаго боку крычаць «дай усё!», а з другога – «нічога!» [13].

**Заключэнне**. Такім чынам, у першыя месяцы Лютаўскай рэвалюцыі расійскае грамадства, у тым ліку сяляне беларускіх губерняў, прынялі абгрунтаванні Часовага ўрада аб небяспечанасці паскоранага правядзення аграрнай рэформы. Але па меры палітызацыі грамадскага жыцця і пагаршэння эканамічнага становішча ў краіне стваралася пагроза для нармальнай падрыхтоўкі аграрнай рэформы.

Адной з асноўных прычынаў запавольвання гэтага працэсу на ўзроўні Міністэрства земляробства і Галоўнага зямельнага камітэта з'яўлялася процідзеянне з боку кадэцкіх міністраў у ажыццяўленні асноўнага патрабавання сялянскіх з'ездаў аб наданні зямельным камітэтам яшчэ да склікання Устаноўчага сходу большых паўнамоцтваў у галіне распараджэння, у тым ліку размеркавання памешчыцкай, царкоўнай і іншай зямлёй.

## Літаратура


1. Шидловский, С. И. Воспоминания / С. И. Шидловский // Страна гибнет сегодня. Воспоминания о Февральской революции 1917 г.: сборник / Сост., послесл., примеч. С. М. Исхакова. – М.: Книга, 1991. – 639 с.
2. Вестник Минского губернского комиссариата. – 1917. – № 14.
3. Собрание узаконений и распоряжений Правительства. За первую половину 1917 года. – Петроград: Сенатская типография, 1917. – 855 с.
4. Керенский, А. Ф. Россия на историческом повороте. Мемуары / А. Ф. Керенский. – М.: Республика, 1993. – 383 с.
5. Веселовский, Б. Главный земельный комитет / Б. Веселовский // Русское слово. – 1917. – 24 мая. – С. 1.
6. Шидловский, С. И. Воспоминания / С. И. Шидловский // Страна гибнет сегодня. Воспоминания о Февральской революции 1917 г.: сборник / Сост., послесл., примеч. С. М. Исхакова. – М.: Книга, 1991. – 639 с.
7. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 628. Гарадоцкі павятовы зямельны камітэт Віцебскай губерні. Воп. 1. Спр. 3.
8. Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы: в 2-х т. Белоруссия в период подготовки социалистической революции (февраль – октябрь 1917 г.) / Редкол.: Г. С. Горбунов, Ф. А. Новиков, М. С. Кравченко и др. – Минск: Госиздат БССР, 1957. – Т. 1. – 1008 с.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). Ф. 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. Воп. 1. Спр. 5.
10. НГАБ. Ф. 2679. Быхаўскі павятовы зямельны камітэт. Воп. 1. Спр. 5.
11. НГАБ. Ф. 2090. Рагачоўская павятовая зямельная ўправа. Воп. 1. Спр. 2.
12. Шидловский, С. И. Воспоминания / С. И. Шидловский // Страна гибнет сегодня. Воспоминания о Февральской революции 1917 г.: сборник / Сост., послесл., примеч. С. М. Исхакова. – М.: Книга, 1991. – 639 с.
13. Съезд представителей земельных комитетов // Народное слово. – 1917. – 27 август. – С. 4.